ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987

22 СТУДЗЕНЯ ЧАЦВЕР

№ 3 (1524)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

## БЮРО ПАРТКОМА

разгледзела пытанне «Аб рабоце партыйных арганізацый факультэтаў і падраздзяленняў па паляпшэнню прапаганды і арганізацыі грамадзянскай абароны ва універсітэце». У прынятай пастанове сакратарам партбюро журфака, фізфака, ФПМ, ВЦ, НДЧ, СКТБ, партгрупоргам кафедраў англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў указана на недастатковую работу партыйных арганізацый па прапагандзе і арганізацыі грамадзянскай абароны. Звернута ўвага кіраўнікоў падраздзяленняў на неабходнасць карэннага паляпшэння стану работы ў даным напрамку.

Бюро таксама разгледзела ход выканання раней прынятых пастаноў і рашэнняў, іншыя патанні арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай работы.

У. САТОЛІН, інструктар парткома.

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ

ў рамках Ленінскага заліку пачалася 20 студзеня і працягнецца па 15 лютага ў камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта. На камсамольскім сходзе СКТБ аднадушна прыняты ліст у адрас XX з'езда ВЛКСМ з прапановамі і заўвагамі па праекту новай рэдакцыі Статута ВЛКСМ. У перыяд ГПА камсамольскія сходы па абмеркаванню пройдуць на ўсіх кафедрах і ў падраздзяленнях.

С. СЯРГЕЕЎ, сакратар камітэта камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

## У КАНЦЭРЦЕ

для дэлегатаў XVI з'езда прафсаюзаў Беларусі прымуць удзел народны ансамбль народнага танца «Крыжачок» і народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».

А. САВІЧ.

## ПА ЗАПРАШЭННЮ

Каўнаскага політэхнічнага інстытута імя Антанаса Снечкуса народная харавая капэла збіраецца ў дарогу. Наша капэла выступіць на VII міжрэспубліканскім конкурсе змешаных хораў вышэйшых навучальных устаноў «Ювентус-87», які з'яўляецца састаўной часткаи II Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці. Дэвіз конкурсу — «Песняй славім дружбу».

М. ТАРАСАВА, мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

# «САМЫ ЛЕПШЫ», або Тры сустрэчы, што адбыліся на падрыхтоўчым факультэце

фотарэпартаж



ПЕРШАЯ. НЕЗВЫЧАЙНАЯ. Не толькі таму, што была яна зваротам у мінулае, але і таму, што раней, скажам, год назад, пра яе і гаворкі быць не магло.

Дзіўная рэч — гісторыя. Час ідзе, і не заўважаеш, як адбываюцца вакол змены. Тым больш, што на падрыхтоўчым факультэце за гэтымі зменамі назіраюць часцей за ўсё не студэнты, а выкладчыкі. Што зробіш: такая ўжо спецыфіка факультэта, на якім студэнты займаюцца толькі адзін год, а потым ідуць вучыцца далей у іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. І ўсё ж гісторыя ў яго ёсць. Таму што жыццё на факультэце, нягледзячы ні на якую спецыфічнасць, цікавае. Да таго ж, ёсць успаміны, што засталіся ў кожнага, хто тут вучыўся. Праўда, адна справа — успаміны для сябе, іншая — гутаркі і сустрэчы са сваімі землякамі — тымі, хто толькі прыехаў вучыцца. Але ж кожнаму не раскажаш, усяго не прыпомніш. Здавалася, выйсце знайсці цяжка. Думка з'явілася нечакана: «А што, калі...»

Зрэшты, давайце пра ўсё па парадку. Раней увесь архіў фотаздымкаў і падарункі, якія прывозілі ад сяброў з іншых краін выкладчыкі, студэнты і дарылі факультэту, тое, што існавала як памяць аб мінулым факультэта і яго справах, захоўвалася ў кабінеце намесніка дэкана І. П. Чэпы. Жадаючыя маглі пазнаёміцца, паглядзець. Толькі вось у чым закавыка: нельга ж кожную групу на экскурсію ў кабінет намесніка дэкана вадзіць. І якая ж гэта экскурсія, калі адразу і не зразумееш, што да чаго. Зразумела, патрэбны быў свой музей. Каб пачынаць знаёмства з Краінай Саветаў з факультэта, які за год павінен стаць па-сапраўднаму родным.

Такое вырашэнне пытання ніколькі не прыніжала ролю экскурсіі па памятных мясцінах горада Мінска, у музей універсітэта. На першым плане павінна быць сустрэча з мінулым факультэта — так лічылі на падрыхтоўчым, рыхтуючыся да стварэння ўласнага музея.

Зараз ён амаль што гатовы сустракаць гасцей. У маленькім заўсёды адлюстроўваецца вялікае. Музей падрыхтоўчага факультэта пакуль мае толькі адну залу. Але ж, пабываўшы ў ёй, пра многае можна даведацца. Тут і фотаздымкі першага выпуску. Таго самага, які скончыў факультэт у 1962 годзе. Стэнды, якія паведамляюць пра дасягненні ў вучэбным працэсе, у мастацкай самадзейнасці, у спартыўных спаборніцтвах... Вялікая колькасць узнагарод і сувеніраў. Пройдзе час, у наступным годзе тыя, хто ўпершыню сустрэнецца з факультэтам, змогуць увачавідкі пераканацца ў тым, што было, і прыняць удзел у стварэнні новага радка гісторыі.

СУСТРЭЧА ДРУГАЯ. Якая таксама не магла адбыцца ў мінулым годзе. Таму што Раджыў Гупта і Таджэндэр Сінгх Калсі, студэнты з Індыі, прыехалі ў Савецкі Саюз толькі ў пачатку гэтага навучальнага года. Ці падабаецца ім у Мінску? На гэтае пытанне Таджэндэр і Раджыў, а таксама іх сябры з іншых краін даюць сцвярджальны адказ. Больш за ўсё ўразілі іх людзі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)



Звычайна ў час знаёмства першым чынам называюць імя. Мы пачнём з біяграфічнай даведкі ў надзеі на тое, што чытач сам здагадаецца, пра што ідзе гаворка.

Дата нараджэння: год 1961.

Месца: горад Мінск. Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна.

За час існавання на ім займалася звыш 4500 студэнтаў з 92 краін свету.

Такім чынам, гаворка будзе пра адзін з факультэтаў. Толькі вось пра які?

# ПАЧЫНАЕЦЦА З ПАДРЫХТОЎЧАГА

давайце знаёміцца

ЗДАЕЦЦА, справа нескладаная — падлічыць, колькі факультэтаў існуе ва універсітэце. «Хімфак, фізфак, гіст...» — пачне нявопытны першакурснік. І наўрад ці назаве гэты. А ён існуе вось ужо дваццаць пяць гадоў — падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян. Першымі студэнтамі факультэта ў 1961—62 навучальным годзе былі юнакі і дзяўчаты з Рэспублікі Куба. За гады існавання першапачатковую і, як лічаць самі студэнты, амаль што самую галоўную падрыхтоўку прайшлі тут студэнты з Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, Лівана, Сірыі, Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан, Алжыра, Эфіопіі і іншых краін.

Падрыхтоўчы факультэт універсітэта з'яўляецца адным са старэйшых падобных факультэтаў. Неаднойчы на яго базе праводзіліся ўсесаюзныя канферэнцыі выкладчыкаў. Важнае месца займае ён і ў сістэме замежных сувязей БДУ імя У. І. Леніна. Найбольш цесныя кантакты наладзіліся з падрыхтоўчым факультэтам Камагуэйскага універсітэта, дзе толькі за апошнія гады працавала 26 факультэцкіх выкладчыкаў рускай мовы, фізікі, хіміі, матэматыкі. Адной з форм міжнароднага супрацоўніцтва з'яўляецца навуковая стажыроўка выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў сацыялістычных краін на падрыхтоўчым факультэце БДУ. Толькі за апошнія пяць гадоў на факультэце прайшлі стажыроўку 12 замежных выкладчыкаў.

Пра сённяшні дзень факультэта, яго здабыткі і планы на будучае расказваюць нашаму карэспандэнту М. ЗАГОРСКАЙ дэкан факультэта У. М. СТРЭЛЬЧАНКА і намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце І. П. ЧЭПА:

— Падрыхтоўчы факультэт пачынаецца не з лічбаў і статыстычных даведак, а з адносін, што складваюцца паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Няхай пра іх раскажуць радкі з лістоў тых, хто атрымаў спецыяльнасць, ужо працуе ў сваёй краіне.

В'етнамец Фан Хыў Шон: «Што я магу сказаць пра падрыхтоўчы факультэт БДУ? На маю думку, ён з'яўляецца адным з лепшых у Савецкім Саюзе. На факультэце нас вучылі рускай мове, фізіцы, матэматыцы, дапамагалі нам у кожнай нашай справе».

Прачытаўшы такое, можна зразумець, чаму часта нашы выпускнікі наведваюць факультэт і ў час вучобы ў іншых навучальных установах, і нават праз 7—10 гадоў пасля заканчэння. Такой была сустрэча з Сельса Трыяна, выпускніком 1962 года, Рафаэлем Грэ — 1965 года. У 1975 годзе ім пашчасціла прыехаць у Ленінград і Маскву. І хоць мала было часу (Рафаэль і Сельса займаліся навуковай працай), але пра факультэт, што дапамог ім у першыя месяцы жыцця ў Савецкім Саюзе, не забыліся.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ

## *слова да будучага абітурыента-87*

ЗАРАЗ у мяне напружаная, але вельмі цікавая, насычаная, адказная пара — перадсесійныя дні. Так, я — студэнтка-завочніца II курса аддзялення журналістыкі. Для мяне вучоба ў БДУ на завочным факультэце — гэта і даўняя мара, і сапраўдная праца, і адчуванне самастойнасці.

Мой выбар гэтага факультэта быў абумоўлены не толькі матэрыяльным становішчам, але і жаданнем паспрабаваць свае сілы, здольнасці і нават волю: а ці змагу і працаваць, і вучыцца адначасова. Не буду ўтойваць: даволі цяжка прыходзіцца часам. Іншы раз патрэбна адмаўляць сабе і сваім сябрам у прагулцы, у вольным часе. Але што можа параўнацца з задавальненнем ад атрыманай адзнакі за вывучаную табой самастойна дысцыпліну, ад ведаў, якімі абагачаешся ты.

Вучыцца самастойна — гэта не значыць вучыцца ў адзіноцтве. На дапамогу заўсёды гатовы прыйсці выкладчыкі, метадысты.

У цябе, дарагі чытач, у гэтым годзе ёсць магчымасць пераканацца ў шчырасці маіх слоў. Перад табой — магчымасць стаць больш разумным, карысным, свядомым чалавекам. Дык смялей. Да сустрэчы!

А. САЎЧЫК.

**БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ імя У. І. Леніна — вядучая ВНУ рэспублікі і краіны.** У кастрычніку 1987 года універсітэту споўніцца 66 гадоў. За гэты час універсітэт вырас як колькасна, так і якасна. Пачынаючы сваю работу з двух факультэтаў — медыцынскага і грамадскіх навук з кантынгентам 1390 студэнтаў,— універсітэт вырас да 12 факультэтаў, на якіх зараз навучаецца больш як 14 тысяч студэнтаў.

Завочны факультэт з'яўляецца адным са старэйшых і шматколькасных. У 1985 годзе факультэт адзначыў свой паўвекавы юбілей. Сёння на яго дзевяці аддзяленнях займаецца звыш чатырох тысяч чалавек. Штогод завочны факультэт выпускае больш 600 спецыялістаў. Выпускнікі завочнага факультэта ўкараняюць атрыманыя імі ва універсітэце веды ў многіх вучэбных, навуковых установах, на прадпрыемствах рэспублікі і краіны. Многія з іх сталі заслужанымі настаўнікамі, вядомымі вучонымі, партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі.

У адпаведнасці з рашэннямі XXVII з'езда КПСС на завочным факультэце павышае сваю кваліфікацыю вялікі атрад педагагічных кадраў школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, прафесійных вучылішчаў. Вучэбную работу з гэтай катэгорыяй студэнтаў-завочнікаў кафедры будуюць, зыходзячы з рэформы вышэйшай, агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы. З вялікай цікавасцю праблемы сучаснай школы абмяркоўваюцца студэнтамі-завочнікамі на навуковых канферэнцыях.

У падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай форме навучання ў БДУ імя У. І. Леніна прымаюць удзел каля 80 універсітэцкіх кафедраў. Дзякуючы чаму вучэбную работу забяспечвае высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў, у саставе якога каля 40 дактараў навук, прафесараў і каля 300 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

Вядучыя прафесары, дацэнты дзеляцца сваім вопытам і ведамі па актуальных пытаннях юрыспрудэнцыі, журналісцкага майстэрства і іншых хвалюючых сучаснага спецыяліста праблемах.

Студэнты-завочнікі атрымліваюць тую ж спецыяльнасць, што і выпускнікі дзённай і вячэрняй форм навучання, і працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры нашай рэспублікі.

Спецыфіка завочнага навучання заключаецца у тым,што асноўны цэнтр у падрыхтоўцы спецыяліста ляжыць на самастойнай рабоце студэнта. Устаноўчана-экзаменацыйныя сесіі з'яўляюцца непрацяглымі: 30 каляндарных дзён на I, II курсах і 40 на ўсіх наступных. Увесь астатні час студэнт-завочнік працуе над вучэбным матэрыялам самастойна. Але і ў міжсесійны перыяд студэнт не застаецца адзін у сваёй вучэбнай дзейнасці. Правільна арганізаваць самастойную работу па вывучэнню кожнай дысцыпліны яму дапамагаюць дэканат і кафедры. Студэнт забяспечваецца графікам самастойнай работы, вучэбна-метадычнай літаратурай па кожнай дысцыпліне. Па суботах на працягу года праводзяцца «дні завочніка». У гэтыя дні ён можа атрымаць кансультацыю па любому пытанню вучэбнай дысцыпліны, паслухаць лекцыю, здаць залік, экзамен.

Вялікую дапамогу студэнтам-завочнікам у іх самастойнай рабоце аказваюць бібліятэка універсітэта і вучэбна-метадычны кабінет завочнага факультэта, якія забяспечваюць студэнтаў вучэбнымі праграмамі, метадычнымі дапаможнікамі, вучэбнай літаратурай.

Партыя і ўрад праяўляюць пастаянны клопат аб працоўнай моладзі, якая імкнецца павысіць сваю кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці. Пастановай Савета Міністраў СССР ад 24 снежня 1982 году студэнтам, якія займаюцца без адрыву ад вытворчасці, прадастаўляюцца ільготы, каб забяспечыць іх паспяховае навучанне.

Творчая работа кафедраў, сістэматычная вучэбная работа студэнтаў, наяўнасць ільгот у агульным спалучэнні прыводзяць да таго, што кожны пяты студэнт-завочнік вучыцца на «добра» і «выдатна», а некаторыя заканчваюць універсітэт з выдатным дыпломам.

Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на аснове інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці вызначае новыя патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, і ў першую чаргу — у сістэме вячэрняй і завочнай форм адукацыі. Рашэнне гэтай задачы ажыццяўляецца на аснове ўдасканалення ўсіх звенняў вучэбна-выхаваўчага працэсу, пошуку новых шляхоў і спосабаў яго інтэнсіфікацыі ў святле асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Абітурыент-87! Завочны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна адчыняе перад табою дзверы ўсіх аддзяленняў,жадае табе з поспехам вытрымаць уступныя экзамены і стаць на шасцігадовы, цяжкі, але цікавы шлях узыходжання да глыбокіх і трывалых ведаў, неабходных савецкаму спецыялісту.

Сардэчна запрашаем на завочны факультэт!

Л. ДАВЫДЗЕНКА,
прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню,
дацэнт.

## МАТЭМАТЫКА



У 1985 ГОДЗЕ адкрыўся набор на аддзяленне матэматыкі завочнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Аддзяленне рыхтуе кваліфікаваныя кадры для работы, звязанай з выкарыстаннем матэматыкі і ЭВМ у акадэмічных, навукова-даследчых і галіновых інстытутах, праектных і планава-эканамічных арганізацыях, вылічальных цэнтрах, заводскіх лабараторыях, а таксама выкладчыкаў сярэдніх школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У адпаведнасці з вучэбным планам выпускнікі аддзялення матэматыкі атрымліваюць фундаментальныя веды ў самых розных галінах тэарэтычнай і прыкладной матэматыкі, вывучаюць праграміраванне і метады вылічэнняў, авалодваюць неабходнымі навыкамі работы на вылічальных машынах.

З верасня 1986 г. падрыхтоўка спецыялістаў-матэматыкаў вядзецца па двух патоках: навукова-вытворчым і навукова-педагагічным. Конкурс паступаючых на кожнае аддзяленне з 1987 года будзе праводзіцца паасобна.

На навукова-вытворчым патоку робіцца акцэнт на навучанне пастаноўцы і рашэнню розных матэматычных задач. Студэнты навукова-педагагічнага патоку вывучаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару і методыку выкладання матэматыкі.

Навучанне на аддзяленні матэматыкі заканчваецца здачай дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму і абаронай дыпломнай работы.

Вучэбны працэс на аддзяленні матэматыкі ажыццяўляюць сем кафедраў: вышэйшай алгебры; геаметрыі і тапалогіі; тэорыі функцый; функцыянальнага аналізу; дыферэнцыяльныхураўненняў; ураўненняў матэматычнай фізікі; лічбавых метадаў і праграміравання.

Выпускнікі аддзялення матэматыкі — навукова-вытворчага патоку — змогуць працаваць у акадэмічных, навукова-даследчых і галіновых інстытутах, праектных і планава-эканамічных арганізацыях, вылічальных цэнтрах і лабараторыях, у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Выпускнікі навукова-педагагічнага патоку змогуць працаваць у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, а таксама ў агульнаадукацыйных школах.

## ПРАВАЗНАЎСТВА



ПАДРЫХТОЎКА спецыялістаў-правазнаўцаў ажыццяўляецца па трох напрамках: дзяржаўна-прававаму, гаспадарча-прававаму і судова-пракурорска-следчаму.

Выпускнікі аддзялення працуюць у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, у міністэрствах, ведамствах, на вытворчых аб'яднаннях, прадпрыемствах, ва ўстановах, у органах юстыцыі, пракуратуры, міліцыі.

Дзяржаўна-прававая. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў, іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання.

Гаспадарча-прававая. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі працуюць юрыстамі ў народнай гаспадарцы ў якасці начальнікаў аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама юрысконсультамі.

Судова-пракурорска-следчая. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, следчых, адвакатаў, натарыусаў, работнікаў апарату абласных аддзелаў юстыцыі, органаў Міністэрства ўнутраных спраў.

Лепшыя студэнты — выпускнікі факультэта — маюць магчымасць паступіць у аспірантуру. Значная частка прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта — былыя выпускнікі.

Вучоныя факультэта прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы многіх законаў Беларускай ССР. Яны былі ўключаны ў рабочыя групы па падрыхтоўцы крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянскага, грамадзянска-працэсуальнага, працоўнага і іншых кодэксаў. Да навукова-даследчай работы па падрыхтоўцы праектаў заканадаўчых актаў прыцягваюцца студэнты. У іх ёсць магчымасць працаваць і па тэарэтычных праблемах дзяржавы і права.

На кафедрах факультэта працуюць навуковыя студэнцкія гурткі.

У працэсе вучобы студэнты праходзяць і вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца вучоба абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

## ГІСТОРЫЯ



ГІСТАРЫЧНЫ факультэт быў адкрыты ў верасні 1934 года. Ён рыхтуе гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства. Выпускнікі факультэта працуюць настаўнікамі, выкладчыкамі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў, супрацоўнікамі музеяў, архіваў і экскурсійных бюро. Многія з іх актыўна працуюць у саставе партыйных і камсамольскіх органаў.

Студэнт-гісторык атрымлівае шырокую гуманітарную адукацыю і глыбокую ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку, а таксама фундаментальныя веды па сацыяльных дысцыплінах.

На факультэце ўдзяляецца вялікая ўвага рабоце са студэнтамі-завочнікамі. Для іх чытаюць лекцыі такія вядомыя вучоныя, як прафесары У. Р. Івашын, У. С. Багданаў, Л. М. Шнеерсон, В. В. Чапко, Д. Б. Мельцар, В. С. Сцёпін, А. С. Кляўчэня і іншыя. Многія з іх з'яўляюцца выпускнікамі гістарычнага факультэта.

Многія былыя студэнты гістфака займаюць зараз высокія і адказныя пасады. Ёсць сярод выпускнікоў дырэктары НДІ, рэктары ВНУ, дэканы, загадчыкі кафедраў грамадскіх навук, адказныя работнікі партыйнага і савецкага апарату.

Студэнты-гісторыкі маюць магчымасць спецыялізавацца па гісторыі СССР, гісторыі БССР, гісторыі КПСС, усеагульнай гісторыі, археалогіі і этнаграфіі, гісторыі рэлігіі і атэізму.

Кафедры факультэта аказваюць дапамогу настаўнікам сярэдніх школ рэспублікі ў паляпшэнні выкладання гісторыі, выдаюць дапаможнікі і метадычныя распрацоўкі для школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На факультэце ёсць музей, які складаецца з аддзелаў археалогіі, этнаграфіі, Старажытнага Усходу, антычнага мастацтва, нумізматыкі і манетных кладаў. У 1977 годзе створаны музей універсітэта.

Факультэт падтрымлівае трывалыя сувязі з Сафійскім (НРБ) і Йенскім (ГДР) універсітэтамі. Кожны год студэнты факультэта праходзяць практыку ў ГДР, знаёмяцца з гісторыяй і культурай гэтай братняй краіны. У сваю чаргу студэнты з Балгарыі, ГДР, Польшчы — частыя госці на факультэце.

# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

## ФІЛАЛОГІЯ



ХТО ЛЮБІЦЬ родную мову і літаратуру, хто жадае быць выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ці выкладчыкам рускай мовы і літаратуры, той запрашаецца на аддзяленні беларускай і рускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры.

Адзін са старэйшых і буйнейшых ва універсітэце філалагічны факультэт мае багатыя і слаўныя традыцыі ў вучобе і выхаванні творчай моладзі. Яны звязаны з навукова-педагагічнай работай на факультэце вядомых вучоных і пісьменнікаў — народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа, акадэміка АН БССР І. І. Замоціна, прафесараў Е. І. Барычэўскага, А. Н. Вазнясенскага, М. Н. Піатуховіча, П. А. Бузука і іншых, якія шмат зрабілі для развіцця лінгвістычнай і літаратуразнаўчай навукі БССР, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай адукацыі, навуковых і культурных устаноў рэспублікі. Гэтыя традыцыі захоўвае і памнажае прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта, у саставе якога сёння налічваецца 125 чалавек, Сярод іх вядомыя пісьменнікі, паэты, крытыкі, члены Саюза пісьменнікаў СССР і БССР: прафесары Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, П. І. Ткачоў, А. Я. Супрун, Л. М. Шакун, П. П. Шуба, І. П. Кахно, А. Б. Плотнікаў, дацэнты Д. Я. Бугаёў, В. П. Рагойша, М. Б. Яфімава і іншыя.

Завочную форму навучання абслугоўвае 7 кафедраў: беларускай мовы, беларускай літаратуры, рускай мовы, рускай класічнай літаратуры, рускай савецкай літаратуры, агульнага і славянскага мовазнаўства, замежнай літаратуры.

Вучэбна-выхаваўчы працэс вядуць тыя ж выкладчыкі, якія дапамагаюць студэнтам-завочнікам набыць устойлівыя і трывалыя веды па вывучаемых прадметах, авалодаць методыкай выкладання мовы і літаратуры, а таксама набыць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы.

Студэнты-завочнікі вывучаюць тыя ж дысцыпліны вучэбнага плана і ў тым жа аб'ёме, што і студэнты стацыянара. Вучэбны працэс на завочным факультэце адрозніваецца ад стацыянарнага тым, што ён дзеліцца на дзве вучэбна-экзаменацыйнай сесіі (зімовую і летнюю) і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў.

Значнае месца ў вучэбным плане студэнтаў-завочнікаў адводзіцца прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Таму яны павінны валодаць глыбокімі ведамі па сучаснай беларускай і рускай мовах, гісторыі беларускай і рускай літаратур, методыцы іх выкладання, старaславянскай мове, культуры мовы, рускай і беларускай дыялекталогіі, фальклору, тэорыі літаратуры, агульнаму мовазнаўству і інш.

Вялікае значэнне надаецца на факультэце вывучэнню грамадскіх дысцыплін, якія фарміруюць у студэнта марксісцка-ленінскі светапогляд і выхоўваюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм, гісторыя СССР і БССР, марксісцка-ленінская філасофія і г. д. Акрамя гэтага, студэнты вывучаюць лацінскую мову, а таксама адну з замежных (англійскую, нямецкую, іспанскую ці французскую), літаратуру народаў СССР і замежную літаратуру (літаратуру краін Еўропы, Азіі і Амерыкі), шэраг дысцыплін па спецыялізацыі, праходзяць вучэбна-педагагічную практыку.

Студэнтам-завочнікам чытаюцца лекцыі, праводзяцца практычныя і семінарскія заняткі. Вучонымі факультэта напісана шмат падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак для студэнтаў-завочнікаў.

Шматгадовая практыка сведчыць аб тым, што студэнты завочнай формы навучання з'яўляюцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-філолагамі, якія з гонарам нясуць высокае званне настаўніка. Многія з выпускнікоў-завочнікаў сталі вядомымі вучонымі, дзеячамі культуры, пісьменнікамі.

## ГЕАГРАФІЯ



ГЕАГРАФІЧНЫ факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў. Таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых, праектных і вытворчых установах і арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

На факультэце два аддзяленні: дзённае і завочнае. У саставе факультэта сем кафедраў і дзве лабараторыі: праблемная навукова-даследчая меліярацыі ландшафтаў і галіновая навукова-даследчая возеразнаўства.

Студэнты завочнага факультэта атрымліваюць спецыяльнасці: фізічная ці эканамічная геаграфія. Студэнты-завочнікі, таксама як і студэнты дзённага аддзялення, вывучаюць грамадскія і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, шырокае кола геаграфічных навук. Усе студэнты слухаюць лекцыі па агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глеб, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, тапаграфіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, геаграфіі БССР, гісторыі і метадалогіі геаграфічнай навукі і іншыя.

Акрамя таго, фізіка-географы вывучаюць геалогію і карысныя выкапні СССР, геаграфію чацвярцічных адкладанняў, ландшафтазнаўства, праблемы фізічнай геаграфіі СССР і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. У ліку спецкурсаў, якія чытаюцца для эканоміка-географаў, — эканамічнае раяніраванне, статыстыка, геаграфія транспарту, школьны турызм і краязнаўства.

Важным відам вучэбнай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў з'яўляюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна» — месца праходжання ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры карпусы інтэрнатаў, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыі. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічныя здымкі мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебу, вызначаюць форму і памеры ўзвышшаў, нізін, іх прыроду, вядуць назіранні за прыродай.

Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў звязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі пішуцца курсавыя і дыпломныя работы.

Як і студэнты дзённай формы навучання, завочнікі прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, падаюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс.

## БІЯЛОГІЯ



БІЯЛАГІЧНЫ факультэт з'яўляецца старэйшым і буйнейшым цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы біёлагаў. Па гэтай спецыяльнасці падрыхтоўка вядзецца на дзённым і завочным аддзяленнях. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «біёлаг, выкладчык біялогіі і хіміі».

Агульнанавуковая падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца пры дапамозе вывучэння цыкла грамадскіх дысцыплін, замежнай мовы, вышэйшай матэматыкі, фізікі, неарганічнай, арганічнай, аналітычнай, фізічнай і калоіднай хіміі, варыяцыйнай статыстыкі. Студэнты вывучаюць таксама педагогіку, псіхалогію, методыку выкладання біялогіі і хіміі, праводзяць педагагічную практыку ў сярэдняй школе.

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем уводзін у спецыяльнасць, заалогіі беспазваночных і пазваночных, анатоміі, марфалогіі сістэматыкі раслін, мікрабіялогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, біяфізікі, гісталогіі, генетыкі, дарвінізму.

На гэтай аснове вядзецца спецыялізацыя студэнтаў па адной з сучасных галін біялогіі: батаніцы, заалогіі, мікрабіялогіі, біяхіміі. Студэнты праходзяць вытворчую практыку ў лабараторыях кафедраў, экспедыцыях, інстытутах Акадэміі навук БССР і іншых навуковых установах, на прамысловых прадпрыемствах.

На факультэце працуе сем кафедраў, комплексная праблемная лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, лабараторыя фотасінтэзу (пры кафедры фізіялогіі раслін), біялагічная станцыя на возеры Нарач, вучэбна-доследная гаспадарка «Шчамысліца», батанічны сад, заалагічны музей. Вучэбны працэс забяспечваюць 28 вучэбных і навукова-даследчых лабараторый і кабінетаў.

Вучэбны працэс на факультэце вядуць больш за 40 дактароў і кандыдатаў біялагічных навук, а таксама супрацоўнікі біялагічных інстытутаў Акадэміі навук БССР.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу ў якасці настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ВНУ, ва ўстановы сістэмы Дзяржаўнага камітэта па ахове прыроды, дзяржаўныя запаведнікі, на прамысловыя прадпрыемствы, а студэнты, якія выявілі здольнасці да навукова-даследчай работы, — ва ўстановы Акадэміі навук БССР, а таксама ў навукова-даследчыя інстытуты Міністэрства аховы здароўя.

## ЖУРНАЛІСТЫКА



ФАКУЛЬТЭТ журналістыкі быў створаны ў 1944 годзе ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва». Утварэнне факультэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны — яшчэ адно сведчанне клопату партыі пра наш друк. Факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна такім чынам з'явіўся роданачальнікам у падрыхтоўцы кадраў для друку ва універсітэтах нашай краіны.

На факультэце ёсць завочнае аддзяленне, якое рыхтуе работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды — газет, часопісаў, радыё і тэлебачання.

За час існавання факультэт падрыхтаваў па стацыянарнай, вячэрняй і завочнай формах навучання больш як 3000 высокакваліфікаваных журналістаў. Многія яго выпускнікі сталі вядомымі партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі работнікамі, грамадскімі дзеячамі, вучонымі. Сёння няма практычна ніводнага раёна, дзе б не працавалі нашы выпускнікі, а многія працуюць за межамі Беларусі.

З кожным годам факультэт набірае сілу. Расце колькасць выкладчыкаў, павышаецца іх кваліфікацыя. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Асабліва гэта відавочна пасля пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». Калі ў пяцідзесятых гадах на факультэце дзейнічала толькі адна кафедра, то зараз іх пяць: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання, зарубежнай журналістыкі і літаратуры. Кафедры ўзначальваюць прафесары і дацэнты. Сёння на факультэце працуюць 39 выкладчыкаў, з іх 6 доктараў навук і 16 дацэнтаў. Сярод іх доктары навук Р. В. Булацкі, Е. Л. Бондарава, А. І. Наркевіч, І. І. Сачанка, Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі.

У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» на факультэце больш глыбока вывучаюцца грамадска-палітычныя, агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны: тэорыя марксізму-ленінізму, гісторыя КПСС, унутраная і знешняя палітыка партыі і ўрада, савецкае права, тэорыя і практыка буржуазнай журналістыкі, метады ідэалагічнай работы, сацыяльная псіхалогія. Па універсітэцкай праграме студэнты вывучаюць беларускую, рускую, замежную мову і літаратуру, практычную стылістыку і рэдагаванне, гісторыю рускай, беларускай, партыйна-савецкай, замежнай камуністычнай і рабочай журналістыкі, тэорыю і практыку тэлебачання і радыёвяшчання, тэхніку газетнай справы, журналісцкае майстэрства.

Факультэт журналістыкі рыхтуе кадры не толькі для рэспублікі, але і для больш чым 48 краін, якія развіваюцца.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў па эканамічных пытаннях. Таму ўводзяцца новыя курсы па вывучэнню актуальных праблем сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, аналізу гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, комплекснай праграме ідэйнага выхавання і інш. Студэнты факультэта выпускаюць сваю вучэбную газету «Журналіст» і альманах «Творчасць журналіста», актыўна ўдзельнічаюць у выпуску шматтыражкі «Беларускі універсітэт», працуюць у гуртках студэнцкага навуковага таварыства, Шмат цікавага даюць ім сустрэчы са старэйшымі калегамі па пяру, вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі, рэжысёрамі.

# ПАЧЫНАЕЦЦА З ПАДРЫХТОЎЧАГА

*давайце знаёміцца*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кожны год падрыхтоўчы факультэт Белдзяржуніверсітэта заканчвае звыш 250 юнакоў і дзяўчат з розных краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Многія выпускнікі, якія вучацца зараз у Мінску, сталі сапраўднымі памочнікамі выкладчыкаў, асабліва ў першыя дні навучальнага года. Дапамагаюць сваім землякам у вучобе, удзельнічаюць у гутарках пра Савецкі Саюз, расказваюць пра сябе і пра факультэт.

У задачу факультэта ўваходзіць навучанне замежных студэнтаў рускай мове і падрыхтоўка іх па матэматыцы, чарчэнню, фізіцы, хіміі, гісторыі савецкага грамадства — дзеля таго, каб, скончыўшы яго, замежныя студэнты змаглі вучыцца далей, слухаць і канспектаваць лекцыі, карыстацца вучэбнай літаратурай.

На факультэце працуюць кафедры рускай мовы і гісторыі савецкага грамадства, прыродазнаўчых дысцыплін. Для арганізацыі вучэбнага працэсу маецца дастатковая колькасць аўдыторый, лінгафонныя кабінеты, кабінет гуказапісу, праграміраванага навучання. Ёсць нават свая кіназала.

Зараз на факультэце працуе 7 кандыдатаў навук, дацэнтаў, 22 старшыя выкладчыкі. Удасканальванню тэарэтычных ведаў выкладчыкаў садзейнічае планамерная работа кафедраў па павышэнню кваліфікацыі. Кожны год 25 працэнтаў выкладчыкаў праходзяць павышэнне кваліфікацыі ва Універсітэце Дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы, Інстытуце рускай мовы імя А. С. Пушкіна і іншых навучальных установах.

Ветэранамі факультэта па праву можна назваць выкладчыкаў, якія стаялі ў яго вытокаў з першага дня яго існавання. Першая загадчыца кафедры рускай мовы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Т. П. Плешчанка, старшыя выкладчыкі Т. І. Анісімава, А. А. Бераснева, В. П. Вадэйка, З. Я. Какошнікава, З. Э. Іванова, Э. М. Мазуркевіч, Т. Л. Пятровіч, А. А. Рудэнка, А. В. Самаль, Л. Ф. Сакавец, Т. І. Тухто, Р. В. Ульянка. Больш як дваццаць гадоў працуюць на факультэце З. У. Акуловіч, Л. М. Быцава, В. К. Васілеўская, М. А. Іванова, Р. І. Кавалёва, Г. С. Літвіненка, Н. І. Ратнікава, Л. П. Чэркас.

Усё больш увагі ўдзяляецца на факультэце ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу. У мэтах аператыўнага вырашэння арганізацыйных і вучэбна-метадычных пытанняў на кафедрах створаны секцыі, кіраўнікамі якіх з'яўляюцца вопытныя, з вялікім педагагічным стажам выкладчыкі. Планы работы, пытанні арганізацыі метадычных семінараў, павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў, матэрыялы кантрольных работ, вучэбна-метадычныя дапаможнікі — усё гэта становіцца прадметам абмеркавання на пасяджэннях кафедраў і секцый.

Многае робіцца выкладчыкамі для таго, каб заняткі былі асноўным звяном не толькі вучэбнага, але і выхаваўчага працэсу. Шырока выкарыстоўваюцца матэрыялы, што знаёмяць замежных студэнтаў з савецкай сучаснасцю, савецкім ладам жыцця, гістарычным і рэвалюцыйным мінулым нашага народа, з дасягненнямі савецкай навукі і тэхнікі.

Адно з галоўных месц займае вывучэнне курса «Савецкі Саюз», у якім ёсць тэмы па гісторыі СССР, філасофіі, палітычнай эканоміі і навуковаму камунізму.

Штогод арганізоўваюцца студэнцкія навукова-практычныя канферэнцыі па грамадска-палітычнай тэматыцы.

Працуюць на факультэце і гурткі выхаднога дня: «Жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць У. І. Леніна», «Каля карты Савецкага Саюза», «Клуб рускай мовы».

Планаванне і арганізацыя палітыка-выхаваўчай работы адлюстроўваюць важнейшыя задачы выхавання, цесна ўвязваюцца са знешняй і ўнутранай палітыкай Савецкай дзяржавы, з мэтамі навучання і выхавання замежных студэнтаў.

Для таго, каб за час вучобы на падрыхтоўчым факультэце замежныя студэнты глыбей пазнаёміліся з жыццём савецкага народа, з поспехамі камуністычнага будаўніцтва, сістэматычна праводзяцца лекцыі аб міжнародным становішчы, аб Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, сістэме народнай адукацыі ў нашай краіне. Праводзяцца сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, Героямі Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы.

Першае знаёмства з савецкай рэчаіснасцю пачынаецца з экскурсій па гораду. Нашых студэнтаў цікавіць усё: і музеі, і дзіцячыя сады, і школы, і заводы, што працуюць у Мінску.

Звычайна пасля такіх экскурсій і сустрэч у вучэбных групах праходзяць гутаркі, дзе студэнты дзеляцца ўражаннямі, спрачаюцца, прапаноўваюць. Неаднойчы ўспаміны пра тую ці іншую экскурсію станавіліся тэмай сачынення, заметкі ў насценную газету, выступлення па радыё.

Вельмі важным у справе інтэрнацыянальнага выхавання замежных студэнтаў з'яўляецца іх сумеснае пражыванне ў інтэрнаце разам з савецкімі студэнтамі. У студэнцкі савет інтэрната ўваходзяць таксама і прадстаўнікі зямляцтваў. Паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі склаліся сяброўскія адносіны, заснаваныя на ўзаемным разуменні і павазе.

Калектыў падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна сустракае сваё 25-годдзе ў пошуках новых форм вучэбна-выхаваўчай і няспыннага ўдасканалення вучэбна-метадычнай работы.

Першы выпуск падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян 1961—1962 навучальнага года.



# «САМЫ ЛЕПШЫ», або Тры сустрэчы, што адбыліся на падрыхтоўчым факультэце

*фотарэпартаж*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Джыбал Шрэстха, што прыехаў з Непала, так і гаворыць: «Надзвычайна добрыя, міралюбівыя, спагадлівыя людзі». У першыя дні, калі нават самыя простыя сказы складаліся з вялікай цяжкасцю, ім дапамагалі. На вуліцах, у магазінах, на факультэце. Зараз яны ўжо многае ведаюць пра Мінск, пра яго мінулае, сучаснае.





Раджыў Гупта: «Я спачатку не ведаў, што Мінск — горад-герой. А аднойчы зусім выпадкова апынуўся побач з Домам-музеем І з'езда РСДРП. Запытаўся: «Што гэта такое?» І здзівіўся таму, з якой павагай аднесліся да мяне навакольныя. Незнаёмыя людзі арганізавалі самую сапраўдную, незвычайную, калі лічыць па колькасці экскурсаводаў, экскурсію. Пасля гэтага вельмі добра ведаю, што Мінск атрымаў такую высокую ўзнагароду за гераізм, самаадданасць яго жыхароў, якія змагаліся з фашызмам у час Вялікай Айчыннай вайны, а потым аднаўлялі зруйнаваны горад».

Таджэндзер Калсі: «Цяжэй за ўсё, аказваецца, без памылак пісаць па-руску. Бачыце,— гаворыць ён і працягвае сшытак,— усё зноў перакрэслена. А колькі ж гадзін на выкананне гэтага задання пайшло!»

Танджэндзер, на маю думку, вельмі самакрытычны, нават несправядліва прыдзірлівы да сябе — не так ужо і многа тых памылак, але, як гаворыць яго зямлячка Кхулар Ніілам,— ён заўсёды жадае, каб усё атрымлівалася на «выдатна».

— Зразумела, вывучаць рускую мову цяжка,— згаджаюцца і іншыя.— Але без яе нельга далей займацца ні гуманітарнымі, ні прыродазнаўчымі навукамі.

— Да таго ж,— дадае Танджэндзер,— у нас цудоўныя выкладчыкі. Яны вельмі добра разумеюць, што адразу ахапіць усё немагчыма, і дапамагаюць нам, забываючыся нават на тое, што іх працоўны дзень ужо скончыўся. Калі ёсць пытанні, трэба толькі задаць іх, а адказ будзе абавязкова. Ёсць у нас і бібліятэка, дзе старшы бібліятэкар Л. У. Грышчанкова і бібліятэкар Ж. І. Якімук заўсёды падкажуць, якім падручнікам карыстацца, дапамогуць адшукаць яго.

**СУСТРЭЧА ТРЭЦЯЯ.** Выпадкова не адбылася. Мы спадзяваліся пабываць на рэпетыцыі хору і танцавальнага калектыву. Вельмі расчараваліся, калі даведаліся, што ў сувязі з экзаменам рэпетыцыі адклалі.

— Справа папраўная,— упэўнена супакоіў нас Аднак Каміс, студэнт з Лівана.

Юнак удзельнічае і ў хоры, і ў танцавальным ансамблі, умее іграць на аргане. Так і пачалася гэтая незапланаваная рэпетыцыя адразу пасля нашай размовы. Звычайна ўсю арганізацыйную работу бралі на сябе выкладчыкі В. І. Курвязава, Т. З. Сафронава, Л. П. Барабанаў. Зараз улада апынулася ў руках Марты Петру. У самым што ні на ёсць прамым сэнсе. Таму што Марта заняла месца дырыжора. Як гэта ў яе атрымалася? Магу запэўніць: па-сапраўднаму. Лёгкі ўзмах рукі — і загучалі словы песні пра мір, якую ўдзельнікі хору рыхтуюць да выступлення на конкурсе мастацкай самадзейнасці.

Дарэчы, яны любяць пець і проста так. Напрыклад, Таджэндзеру падабаюцца песні, якія выконвае Ю. Антонаў, і таму ён ведае многія з іх.

Вось такія тры сустрэчы адбыліся на падрыхтоўчым факультэце замежных студэнтаў. Пасляслоўем да іх будуць словы Мэры Ігнату, якая прыехала вучыцца ў СССР з Кіпра:

— Нам здаецца, што факультэт наш самы лепшы.

Сумнявацца ў гэтым не прыходзіцца, бо ўсе астатнія з такім сцвярджэннем згадзіліся.

З. МАРАВА.



Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

22 студзеня 1987 года.

АТ 06072. Зак. 136.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.